УДК 947.083
ББК 63.3(2)52
З12

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ

Праца выканана ў рамках тэм «Заканадаўчы вопыт Расійскай імперыі пачатку XX ст. пры фарміраванні парламенцкіх інстытутаў Рэспублікі Беларусь» і «Эвалюцыя саслоўнага і бессаслоўнага самакіравання ў Беларусі. 1861–1917 гг.», уключаных у Дзяржаўную комплексную праграму навуковых даследаванняў на 2006–2010 гг. «Гісторыя беларускай нацыі, дзяржаўнасці і культуры» («Гісторыя і культура»).

*Рэцэнзенты:*
доктар гістарычных навук, прафесар кафедры славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі БДПУ *А.П. Жытко;*
доктар гістарычных навук, прафесар кафедры гісторыі Беларусі і паліталогіі БДТУ *М.Я. Сяменчык*

**Забаўскі, М.М.**
З12 Расійская Дзяржаўная дума ў лёсах Беларусі (1906–1917 гг.) : манаграфія / М.М. Забаўскі. – Мінск : БДПУ, 2008. – 267 с.
ISBN 978-985-501-536-0.

У манаграфіі адлюстравана сутнасць выбарчага заканадаўства па выбарах у Дзяржаўную думу I і II скліканняў, яго змены ад 3 чэрвеня 1907 г. Паказаны вынікі выбарчых кампаній у Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Мінскай губернях. Аналізуюцца палітычныя пазіцыі дэпутатаў ад Беларусі ў Думе, дзейнасць палітычных партый і груп, іх органаў друку вакол першага расійскага парламента. Вызначаецца кірунак дзейнасці ўрада ў міжрэвалюцыйны перыяд.

Адрасуецца навукоўцам, выкладчыкам навучальных устаноў, студэнтам, усім, хто цікавіцца гісторыяй Беларусі.

**УДК 947.083**
**ББК 63.3 (2)52**

**ISBN 978-985-501-536-0**

© Забаўскі М.М., манаграфія, 2008
© БДПУ, 2008

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка»

М.М. Забаўскі

# РАСІЙСКАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ ДУМА Ў ЛЁСАХ БЕЛАРУСІ (1906-1917 гг.)

***Манаграфія***

Мінск 2008

БГПУ БИБЛИОТЕКА
ИНВ № 1677276

Репозиторий БГПУ



*Раменчык Даніла Якаўлевіч*



*Шыманскі Іван Адамавіч*



*Якубовіч Вячаслаў Андрэевіч*



# Глава 4. РАСКЛАД ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫХ СІЛ У БЕЛАРУСІ ВАКОЛ ВЫБАРАЎ І ДЗЕЙНАСЦІ РАСІЙСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАЙ ДУМЫ ТРЭЦЯГА СКЛІКАННЯ

## 4.1. Выбарчы закон ад 3 чэрвеня 1907 г.

3 чэрвеня 1907 г. урадам быў апублікаваны Маніфест аб роспуску II Дзяржаўнай думы і змяненні «Палажэння аб выбарах» (табліца 13). Царскі ўказ ішоў уразрэз з Маніфестам ад 17 кастрычніка 1905 г. і Асноўнымі законамі Расійскай імперыі (1906 г.), якія забаранялі без згоды Думы выдаваць новыя законы. Па Маніфесце ад 3 чэрвеня права адмяняць выбарчыя законы і выдаваць новыя захоўвалася за царом. Галоўным натхняльнікам акта 3 чэрвеня быў «Савет аб'яднанага дваранства» – агульнарасійская дваранская арганізацыя, якая значна ўплывала на палітыку самадзяржаўя. Некаторыя ўплывовыя члены «Савета» выступалі за ліквідацыю расійскага «парламента» наогул. Але царызм на гэты крок не адважыўся.

Урадам былі прыняты ўсе меры для падтрымання «парадку» ў прадбачанні незадавальнення ў народзе ў сувязі з разгонам II Думы і выданнем новага выбарчага закона. 70% губерняў краіны заставаліся ці былі абвешчаны на становішчы «ўзмоцненай аховы», якое ўводзілася на адзін год міністрам унутраных спраў ці генерал-губернатарамі ў тых мясцовасцях, дзе «грамадскі спакой» парушаўся замахамі супраць існуючага дзяржаўнага ладу». Адміністрацыя атрымлівала права праводзіць вобыскі, высылаць падазроных асоб. У тых раёнах, дзе насельніцтва было «прыведзена ў трывожны стан», Саветам Міністраў на 6 месяцаў уводзілася «надзвычайнае становішча». Яно давала права генерал-губернатарам закрываць навучальныя ўстановы, здымаць з пасад чыноўнікаў усіх ведамстваў і выбарчых асоб, ствараць спецыяльныя ваенна-паліцэйскія каманды для падаўлення «хваляванняў».

Указам міністра ўнутраных спраў становішча «ўзмоцненай аховы» было працягнута да 20 красавіка 1908 г. у Вільні і Смаргоні (Віленская губ.), а таксама ў Гродне, Пружанскім і Кобрынскім паветах Гродзенскай губерні [87, 3, 176, л. 137–138]. Пільная ўвага ў Заходнім краі надавалася Мінскай губерні і г. Мінску, дзе таксама захоўвалася становішча «ўзмоцненай аховы» [87, арк. 34]. Газета «Речь» паведамляла: «З раніцы 3 чэрвеня ў горад былі сцягнуты вартавыя, якія патрулявалі на вуліцах. Акрамя таго, у горад былі выкліканы два батальёны пяхоты [63]. Па хадайніцтве магілёўскага губернатара на становішчы «ўзмоцненай аховы» былі пакінуты Гомель і павет».

Мясцовымі ўладамі прыводзіліся ў гатоўнасць жандарска-паліцэйскія сілы. Павялічыліся асігнаванні з дзяржаўнай казны на ўмацаванне паліцэйскага апа-



Репозиторий БГПУ